# Звяры пад доглядам чалавека

Дух прэрыяў індыйскіх вігвамаў далекіх падарожжаў напаўняе ўражлівыя душы дзяцей, наведвальнікау Мінскага заапарку. На гарыстых схілах і пад дрэвамі яны бачаць цароў прыроды - ільвоу з рудымі грывамц, якія мірна дрэмлюць у сваіх логавах, рысяў, тыграў і ваўкоў, самі на хвіліны ператвараюцца ў каўбоеў, асядлаўшы белых коней з доўгімі касмылямі. Далей адкрываюцца пляцоўкі з дауганогімі страусамі, вярблюдамі Марскія коцікі ныраюць у ваду, зрэдку паказваючы бліскучыя спіны.

У Беларусі за апошнія 20 гадоў створаны шэсць заалагічных паркау, якія маюць статус прыродаахоўных, жывёлаабаронччых, асветніцкіх аб'ектаў. У Менскім заапарку жыве 2300 хрыбетных жывёл, якія належаць да 270 відау і 15 відаў бесхрыбетных.

Сталічны заапарк быў адчынены ў жніўне 1984 года ў дзень гадавіны заснавання Менскага аўтазавода. Яго фундатарам стаў ветэран аўтазавода Фёдар Ідэлевіч Рэўзш, таленавіты вынаходнік, пісьменнік-натураліст. Яго апошняя кніга “Шэры воўк вярнуўся да людзей" была надрукавана у 1999 годзе ў Ізраілі і прысвечана беларускай прыродзе.

Федар Рэўзін каля трыццаці гадоў быў старшыннём клуба аматараў прыроды МАЗа.

Аднойчы ён убачыў стары дуб, вырваны з карэннем на месцы будоўлі. Тыдзень дрэва праляжала на сырой восеньскай зямлі Даведаўшыся пра гэта Фёдар падагнаў паўпрычэп, на якім перавозілі цяжкія танкі, даставіў дрэва ў горад. Жыццё старажытнага асілка працягнулася на новым месцы. Першы год паіла волата з дубровы палівачная машына.

Каржакаваты няўломак ажыў і праз некалькі год абсыпаў зямлю моцнымі бліскучымі жалудамі. Цяпер казачны дуб служыць укрыццем для птушак.

У 1987 годзе быў падрыхтаваны праэкт развцця заасада. Часовыя дамкі і вальеры. пабудаваныя у 1984 годзе, меркавалася замяніць новымі, што і было з часам выдач не зроблена. Але нават і ў тыя часы, нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, паспяхова ўтрымліваліся і распаўсюджваліся такія віды жывёл. як рысі, бурыя мядзведзі шыншылы, стэпавыя арлы. Даследаваўшы тэрыторыю, якая пралягае ў пойме ракі Свіслач, арітолагі параілі аддаць перавагу вадаплаўным птушкам. Старое русла і ручай аблюбавалі лебедзі –шыпуны, шэрыя гусі, канадскія казаркі, чырвонагаловыя ныркі, чаротаўніцы і цалая ироцьма пярнатага свету. Тут заўсёды аказвалася дапамога дзікім жывелам, якія патрапілі ў нядолю. Кожную зіму з тых пор пшена прытульваў розныя віды драпежных і капятных жывёл, якім была патрэбна ветэрынарная дапамога.

У 1993 годзе гарадскія улады пайшлі насустрач заапарку і выдаткавалі сродкі на будаўніцтва за кошт фонду аховы прыроды Менскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя. У 1997 годзе заасад атрымаў статус прадпрыемства "Менскі заапарк", і тэрыторыяяго пашарылася.

У тым жа годзе Менскі заапарк стаў сябрам Еўраазіяцкія рэгіянальиай асацыяцыі заапаркаў і акварыюмаў, у якую ўваходзяць каля 50 заапаркаў цэнтраў абароны жывёлаў з Чэхіі, Балтыі, краін СНД, Расіі, прымае ўдзел у міжнародных праграмах на захаванне рэдкіх відаў жывёл.

У 2001 годзе горад зарэзерваваў пад пашырэнне заапарку тэрыторыю ў 42 гектары. Другая чарга рэканструкцыі пашырыць экспазіцыйны комплекс для ўтрымання прадстаўнікоў фаўны Паўдневай Амерыкі. Трапічны павільён вышынёй ў 14 метраў дазволіць наведвальнікам паглыбляцца ў вільготную атмасферу джунгляў.

## Сям'я пушчансіх волатаў

Каля вальера з самымі магутнымі насельнікамі ўдалося атрымаць цікавую інфармацыю. На Беларусі зараз на волі жыве 565 зуброў, якія ствараюць. 8 папуляцый. Старэйшыя з іх памятаюць грандыёзныя палацы, асвечаныя сонечным золатам, усю раскошу лясных аранжарэяў, гіганцкія шматпавярховыя залы з калонамі векавых ствалоў Белавежы.

У 1919 годзе зубры на волі былі знішчаныя і захаваліся толькі ў заапарках, з гэтага яны працягнулі свой каралеўскі род.

У Менскім заапарку жыве сям'я з чатырох зуброў. Даваць імёны гэтым велічпым магутным жывёлам, з вялізарнымі грывамі, ціхай стоснай павольнай сілай прынята з літары назвы краіны. Таму менскіх волата і назвалі Барон і Барышня. Барчонак і Бусінка. Два зубраняткі нарадзіліся тут на водах Свіслачы. Гараджане выбіралі імёны ім адпаве дна конкурсу. Каля вальера з пушчанскімі асілкамі - натоўп народу. Маладзенькая матуля смела ласуе бацьку-зубра морквінамі ды капустай, а дзеці дзівяцца з яго моцы і спакою.

Двухгорбы вярблюд Хан быў падараны заапарку артысткай-дрэсіроўшчыцай Тэрэзай Дуравай у 80-тыя гады. Прыгажун выступаў на арэне цырку, пакуль у яго не здарыўся рэўматызм. Тады цыркавую кар'еру прыйшлося спыніць і перабрацца ў заасад. Новую пару маладых вярблюдаў наведвальнікі назвалі-Каракум і Сахара. Ад іх чакаюць прыплоду.

Дзіку Хрушы - амаль двадцаць гадоў. Калісці яго паілі з бутэлечкі, а цяпер ен адчайны вяпрук з ікламі. Здавалася б век яго рухаецца да старасці. Але як толькі ў вальер да яго патрапілі маленькія асіроцелыя парсючкі, ён пазбадзерыўся, узяў іх пад апеку.

**Дзеці і звеаняты.**

Пра тое, хто даглядае чатырохногіх сяброў, як яны харчуюцца і бавяць час, мы распыталі супрацоўнікаў асветніцкага аддзела заапарка Кацярыну Кандратобіч.

Кацярына, навуковы супрацоўнік, у якой вочы так і ззяюць ад захаплення, вядзе экскурсіі, стварае калекцыі, збірае літаратуру. "Калі я прыйшла сюды ўпершыню мяне вельмі здзівіла, як добра і разнастайна кормяць звяроў; прапануюць багаты рацыён гародніны, пладоў і ягад, дадаюць аліўкавы алей, Дзякуючы гэтаму ў аленяў, лісак і мядзведзяў густая і доўгая поўсць. Людці ставяцца да іх з вялікай дабрыней, напрыклад, на жывёльнай кухні робяць бутэрбродзікі з тварагом і чарэшнямі для маленькіх з вялікім кавалкам мяса заатэхнік дбайна выразае пражылкі і неякасныя кавалкі. У адзін з дзён мы дазваляем наведвальнікам прыносіць харчаванне для звяроў - крупы (у запячатаных пакунках), гародзіну, толькі якасную."

"Звяры ахвотна прыносяць прыплод у заапарку. У нас моцная ветэрынярная служба, мы дапамагаем гараджанам, якія трымаюиь дома незвычайных гадаванцаў, даём кансультацыі і парады. З нашымі насельнікамі працаюць заатэхнікі і рабочыя у групах, якія прыбіраюць штодня. Мастак - аматар упрыгожвае парк прыгодніцкімі выявамі У гуртку верхавой язды вучым дзяцей ездзць на конях. Шчыра сябруем з клоўнамі, артыстамі, танцорамі з " Качаткоў-тэатру" і ншых калектываў, яны забаўляюць дзяцей і дарослых на вакацыях і выходных."

"Мы ахоўваем і разводзім рэдкіх жывёл.- дадае Кацярына Аляксандрауна, -якая дзяжурыць у выходны дзень у асведніцкім адзеле,- З нашых выхаванцаў занесеныя у Чывоную Кнігу Беларусі такія звяры як буры мядзведзь. барсук, зубр, з птушак - арлан-белахвосг, шэры жораў, чорны бусел.

**Цёплая поўсць лечыць**

Падарожжа працягваецца, і наведвальнікі заходзянь у "Вясковую сядзібу", кантактную пляцоўку, якая створана для блізкага знаёмства з маладзняком. За прыгожай агароджай з лазовых галін дазваляецца тое, што забаронена ў якіх заапарках. Тут можна прылашчыць маленькіх казлянят, у якіх толькі адрастаюць рожкі, пагладзіць трусянят, гусянят, парсючкоў. Псіхолагі сцвярджаюць, што цесныя зносіны з жывёлам дабратворна ўплываюць на душу дзяцей, а таксама лечаць цялесныя нядуг. Дзецям інвалідам рэкамендаваны заняткі з конямі і сабакамі, іх стан пасля гэтага значна паляпшаецца. Для кантактнай пляцоўкі жывелы падбірнаюцца з мірным і адкрытым характарам

У заапарку гараджане, не маюць прысядзібнай гаспадаркі, вяртаюць на іміненні старазапаветную насычанасць жыцця. калі чалавек жыў у згодзе з жывёламі, трымаў свае статку, якія служылі сімвалам нам дабраславення і дастатку, а рахманыя ягняты знахадяцца пад ішьным доглядам клапатлівага гаспадара.

***Э.Дзвинская***

**Источник:** Наша слова.-2009.-7 кастр.-С.4.